ГАЗЕТА З БЕЛАРУСІ

ГОЛАС РАДЗІМЫ

ВЫДАЕЦЦА З 1955 ГОДА ● NO.21 (3237) ● ЧАЦВЕР, 9 ЧЭРВЕНЯ, 2011

ШТОТЫДНЁВІК “ГОЛАС РАДЗІМЫ” МОЖНА ЧЫТАЦЬ У ІНТЭРНЭЦЕ: **WWW.GOLAS.BY**

Родны гоман у Прыбайкаллі

Вядомая беларуская суполка з Іркуцкай вобласці зладзіла вялікі фэст-конкурс з нагоды свайго 15-годдзя Стар. 2

“Дзівосна цэласны свет духоўна блізкіх мне людзей...”

Масквічка Ніна Дзябольская ўражана сугучнасцю беларускай паэзіі з французскай Стар. 3

У кнігалюбаў тут цікавы асяродак

Бібліятэкары Астравеччыны ў Дзень славянскага пісьменства запрасілі ў госці калег з Мядзельшчыны Стар. 4

ПОВЯЗЬ ЧАСОЎ

Мелодыі з глыбокай даўніны

Замак у Міры ёміста поўніўся гучаннем старадаўняй музыкі

Іван Іванаў

Уявіце сабе: тыя ж прыгожыя сугуччы радавалі слых людзей і сто, і, можа, нават дзвесце гадоў таму… Даўняя музыка ў атачэнні пасівелых архітэктурных формаў — гэта заўсёды ўражлівы сінтэз. Болей таго, такія імпрэзы прымнажаюць славу гістарычных месцаў. І многія сядзібы, палацы нашай зямлі ведалі ўжо ў былыя часы падобныя прадстаўленні. Згадаем хоць бы імпрэзы на пленэры тэатра ў Слоніме, які пачынаўся з 1770 года, ці “сядзібу музаў” Агінскага ў Залессі на Смаргоншчыне, ці Нясвіжскі палац Радзівілаў… На свяце мастацтваў “Мірскі замак — гонар ЮНЕСКА”, якое ладзілася напрыканцы мая ў гарадскім пасёлку Мір, магутныя сцены замка нібы поўніліся дыханнем даўніх часоў. Гучалі старадаўнія творы, аўтары якіх — выхадцы з шляхецкага роду Карловічаў, які мае карані ў зямлі Гродзеншчыны. Напаўнялі паветра гукі з духоўных сачыненняў мінулых стагоддзяў. Знайшлося месца і добрай эстраднай музыцы.

Арганізатарам свята, асноўнай творчай сілай праекта ў ліку іншых выступіў Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам Міхаіла Фінберга. Як вядома, Мірскі замак — гэта і гонар Беларусі, і помнік сусветнага значэння. А цяпер яшчэ і яскравы сімвал адраджэння мастацкай, гістарычнай спадчыны Беларусі, у тым ліку і музычнай. Свята мастацтваў пачалося з выступлення ва ўтульным унутраным дворыку замка ансамбля “Інтрада”, створанага пры аркестры. Потым адметную канцэртную праграму прадставіў для ветэранаў вайны і працы Карэліцкага раёна камерны хор аркестра. А яшчэ іграли ансамблі флейтыстаў і кларнетыстаў. І была цікавая прэм'ера канцэртнай праграмы “Музычная спадчына Беларусі: песняры Гарадзенскай зямлі Ян і Мечыслаў Карловічы”. Гучалі флейты, трубы, кларнеты, салісты ігралі на драўляных духавых інструментах. Дадавалі душэўнасці ў музычную плынь свята вакальны ансамбль і струнны аркестр. А камерны хор знаёміў слухачоў з беларускай духоўнай музыкай у Мікалаеўскім касцёле мястэчка.

Фінальны акорд свята — гала-канцэрт аркестра пад кіраўніцтвам народнага артыста Беларусі, прафесара Міхаіла Фінберга. Дарэчы, на свяце ў Міры маэстра паведаміў, што сёлета чарговы Фэст беларускай паэзіі і песні адбудзецца напярэдадні кірмашу працаўнікоў сяла “Дажынкі-2011” у Маладзечне. Рэпетыцыі ж аркестра ідуць адначасова па трох розных праграмах. Міхаіл Фінберг задаволены тым, што Мірскі замак, мястэчка Мір сустракаюць фэст ужо ў дзявяты раз. “Такія фэсты ўнікальныя. І кожны з іх — гэта новая праграма, якая мае навуковую аснову”, — адзначыў вядомы дырыжор. Ён нагадаў, што фэст “Мірскі замак — гонар ЮНЕСКА” — 128-ы па ліку сярод тых, якія аркестр мэтанакіравана праводзіць у малых гарадах.

БЕЛТА

Даўнія мелодыі на сучасны лад гучаць ля сцен Мірскага замка

ЗЕМЛЯКІ

Дарога з Дзівіна да Кіева. І дадому...

Хоць вясковец з Кобрынскага раёна Віталь Курашык пачынаў працоўнае жыццё шахцёрам, ды заўсёды цікавіўся дыпламатыяй. І ўрэшце тыя веды, як і багаты досвед работы з людзьмі, вельмі яму спатрэбіліся.

Іван Ждановіч

Нямногія з беларусаў замежжа зрабілі такую кар’еру. У 55-м Віталь Курашык, закончыўшы сярэднюю школу ў палескім мястэчку Дзівін, падаўся на Украіну, у індустрыяльны Данбас. Там працаваў у шахце “Качагарка” горада Горлаўка і адначасова вучыўся ў горным тэхнікуме. Завочна атрымаў вышэйшую адукацыю, працаваў тэхнолагам на заводзе. А з 82-га ён ужо — старшыня гарвыканкама крымскага горада Еўпаторыя. Далей былі розныя адказныя пасады ў Сімферопалі. У 89-м Віталь Уладзіміравіч на альтэрнатыўнай аснове абраны старшынёй Крымскага аблвыканкама, а ў 91-м — Старшынёй Савета Міністраў Крыма. Дарэчы, Віталь Курашык напісаў і выдаў ва Украіне ажно пяць дакументальных кніг, даслаў нядаўна ў рэдакцыю дзве з іх: “Я не жадаю іншай долі. Запіскі дыпламата” і “Жыві і помні”. І ў іх ёсць надзвычай цікавыя звесткі пра асаблівасці яго тагачаснай працы.

Апісвае Віталь Уладзіміравіч і працу ў беларускім пасольстве: абставіны склаліся так, што яму прапанавалі высокую дыпламатычную пасаду, і ў маі 93-га ён быў прызначаны першым Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Рэспублікі Беларусь ва Украіне. Прычым, што цікава, Курашык нават не з’яўляўся на момант прызначэння грамадзянінам Беларусі. Гэта, кажуць, рэдкі выпадак у сусветнай дыппрактыцы. Ганарыцца Віталь Уладзіміравіч і тым, што з 1999-га па 2001 год быў дуайенам, старэйшынай дыпкорпуса ва Украіне.

А як склалася жыццё першага пасла Беларусі ў братняй Украіне пасля таго, як ён дзесяць гадоў таму папрасіў пра адстаўку? Чым жыве сёння? На гэтыя пытанні я нядаўна атрымаў ад Віталя Уладзіміравіча адказы па электроннай пошце. “Пасля дыпслужбы працаваў першым віцэ-прэзідэнтам Міжрэгіянальнай Акадэміі кіравання персаналам, дарадцам прадстаўніка прэзідэнта ААТ “Лукойл” ва Украіне, а з 2004-га займаюся ў асноўным грамадскай работай, — напісаў ён. — А яе, дарэчы, вельмі шмат, бо я ж і ганаровы старшыня Усеўкраінскага саюза беларусаў”.

Ён ніколі не губляў сувязі з Бацькаўшчынай. Як не выпадала летам адпачыць у Беларусі, ехаў у беларускія санаторыі ў Сочы, Літву ці Крым — там “адводзіў душу” ў размовах з землякамі. Пад час працы паслом часцей бываў у Мінску і абавязкова вяртаўся ў Кіеў праз Дзівін. “Там жывуць па гэты час мае браты і сёстры, мае сябры і аднакласнікі, — піша В. Курашык. — І так часта, калі пара ўжо расставацца, ад’язджаць з роднай зямлі, у маёй душы гучаць шчымлівыя словы: “Взойдём на пригорок, и хочется стать на колени.../ Стихи, как молитвы, сквозь слезы читать наизусть.../ Родная земля! Всех тревог ты моих утоленье,/ К тебе прикоснулся — и чище душой становлюсь”. → Стар. 3

ВЕСТКІ

Месца на біенале

Нацыянальны павільён Беларусі афіцыйна адкрыты на 54-й Міжнароднай выставе сучаснага мастацтва ў Венецыі

На прэстыжным форуме сучасную інтэрпрэтацыю афармлення тэксту Kodex прадстаўляюць пяць беларускіх мастакоў: Юрый Алісевіч, Артур Клінаў, Канстанцін Касцючэнка, Віктар Пятроў і Дзяніс Скварцоў. Іх творчыя пошукі, эксперыменты і склалі кампазіцыю, у якой ёсць аб'ёмная пластыка, танальная і колеравая графіка.

Над праектам экспазіцыі працавала група спецыялістаў пад кіраўніцтвам рэктара Беларускай акадэміі мастацтваў Міхаіла Баразны.

НАВАКОЛЛЕ

Як пачынаюцца лясы

Кожны руплівы гаспадар ведае: важкага ўраджаю не атрымаеш без добрага насення. Тое ж правіла земляробаў “працуе” і ў лесе.

Іна Ганчаровіч

Таму і створаны Беларускі лясны селекцыйна-насенняводчы цэнтр. Тут штогод перапрацоўваецца каля 150 тон шышак сасны і елкі. Жартам супрацоўнікі цэнтра завуць яго радзільняй: менавіта пад іх пільным наглядам насенне і будучыя маладыя высадкі атрымліваюць першыя “пашпарты”. Гэта такія пасведчанні па кандыцыйнасці, у якіх указаны як радаводныя звесткі пра будучыя дрэвы, так і дакладнае месца і час збору насення: у выпадку чаго можна і пабачыць, вывучыць старэйшых “родзічаў” будучых бароў ці дуброў.

Але адкуль тыя дзясяткі тон сыравіны? “Шышкі, жалуды нам пастаўляюць лясгасы, збіраюць іх і са спецплантацый, дзе растуць дрэвы з палепшанымі якасцямі, — раскрывае прафесійныя сакрэты дырэктар цэнтра Людміла Жызнеўская. — Мы і перапрацоўваем сыравіну, і гадуем будучыя дрэвы. Тут жа ёсць сховішча ўсяго рэзервовага фонду ляснога насення Беларусі. Цяпер на захаванні, дарэчы, 12 тон насення іглічных парод. Многа ці мала? Мяркуйце самі: гэта амаль чатырохгадовы запас высеву ў краіне”.

БЕЛТА

Ад прыгажосці родных лясоў часам галава ідзе кругам…

Сёлета ж, па прагнозах супрацоўнікаў Цэнтра, чакаецца неблагі ўраджай елкі еўрапейскай. Між іншым, менавіта яе насенне ў Беларусі ахвотна закупляюць шведскія селекцыянеры. Яны лічаць, што па шэрагу важнейшых характарыстык нашы елкі “перамагаюць” тыя, што маюць шведскія родавыя карані. Насенне з беларускіх лясоў на працягу многіх гадоў купляе Расія, прыбалтыйскія і скандынаўскія краіны — таксама сярод асноўных экспарцёраў. “З пачатку года насення сасны прададзена ўжо больш чым на 700 мільёнаў беларускіх рублёў. Сёлета амаль у тры разы больш выручылі і за пасадкавы матэрыял, на экспарт пайшло звыш 21 мільёна аднагадовых і двухгадовых сеянцаў сасны. Насенне ж елкі амаль не прадавалі як найбольш каштоўнае, хіба што невялікую партыю даўнім партнёрам са Швецыі”, — расказала загадчыца сектара ўзнаўлення лесу і лесамеліярацыі Мінлясгаса Марыя Герасіменка.

Вялікія лесапасадкі будуць весціся цэлы год і ў Беларусі. Акцыя “Тыдзень лесу”, што ў пяты раз ладзілася ў краіне, па колькасці ўдзельнікаў, высаджаных дрэў была самай маштабнай. У Мінлясгасе паведамілі, што звыш 50 тысяч добраахвотнікаў і лесаводаў высадзілі 35 мільёнаў новых дрэў на плошчы ў 5 тысяч гектараў. На кожнага жыхара краіны — болей чым па тры дрэвы.

У акцыі, што ахапіла ўсе рэгіёны, мог паўдзельнічаць кожны, папярэдне ўзгадніўшы з лесаводамі дзень і месца працы.

Падтрымліваючы рашэнне Генеральнай Асамблеі ААН аб правядзенні Міжнароднага года лясоў, Урад Беларусі зацвердзіў вялікі план адпаведных мерапрыемстваў, і “Тыдзень лесу” — адзін з першых крокаў па яго рэалізацыі. Аж да лістапада сёлета па краіне будуць ладзіцца акцыі па пасадцы лясоў, навядзенні парадку ў іх і ўздоўж аўтадарог, па берагах рэчак, прылеглых да лясных масіваў.

ЯК СПРАВЫ, ДЫЯСПАРА?

Родны гоман у Прыбайкаллі

Беларуская суполка з Іркуцкай вобласці зладзіла змястоўны фэст-конкурс з нагоды свайго 15-годдзя

Іван Яцкавец

Якраз паміж вясной і летам, 31 мая, дзень нараджэння ў рэгіянальнай грамадскай арганізацыі “Іркуцкае таварыства Беларускай культуры імя Яна Чэрскага” (ІТБК). Віншуем са святам, землякі! Няхай ніколі не перасыхаюць крыніцы беларускасці, з якіх вы чэрпаеце сілы, ідэі для ўсё новых творчых праектаў удалечыні ад Бацькаўшчыны!

Ад пачатку заснавання ІТБК, нагадаем, суполкай кіруе ўраджэнец Полаччыны, былы вайсковец Алег Рудакоў. Вакол яго сабраўся дзеяздольны актыў, плённа працуе абласная Рада ІТБК. Нямала садзейнічае яднанню землякоў у Прыбайкаллі газета “Маланка”. І юбілей супольнай працы ў Іркуцку адзначылі з размахам: зладзілі чарговы, сёмы па ліку, Абласны фэст-конкурс “Гучы, гоман Беларускі!” Прысвячаўся ён як юбілею таварыства, так і 350-годдзю горада Іркуцка.

Дарэчы, можа, пара ўжо скласці на будучыню грунтоўны гадавы каляндар беларускіх суполак свету? Каб заўсёды памятаць пра знакавыя даты, падзеі ў жыцці дыяспары, іх актывістаў. Думаецца, у Іркуцкага таварыства, якое мае цяпер 12 філіялаў, шмат творчых гуртоў па раёнах вобласці, “чырвоных” датаў назбіраецца не адзін дзясятак! У Іркуцку ж, паведамляюць землякі ў рэдакцыю, штогод беларусы святкуюць не толькі Каляды ці Купалле, але і Гуканне вясны, Грамніцы, Багач, “рэстаўравалі” нават такое экзатычнае веснавое свята, як Камаедзіца. Але хто б узяўся зрабіць адмысловы каляндар? Можа, на чарговым пасяджэнні Кансультатыўнага савета па дыяспары, якое праз месяц будзе ў Мінску, закрануць і гэтае пытанне?

А фэст-конкурс “Гучы, гоман Беларускі!”, як паведаміў у рэдакцыю Алег Рудакоў, сабраў калектывы і выканаўцаў “твораў беларускай тэматыкі” з усёй Іркуцкай вобласці. Былі госці з Мінска, Новасібірска, Цюмені. На фэсце ладзіліся не толькі творчыя конкурсы ў розных намінацыях, але і прэзентавалася вялікая работа таварыства за 15 гадоў. Яна, дарэчы, ідзе па 20 асноўных кірунках, актыў суполкі ладзіць шэраг сацыяльна значных мерапрыемстваў, што маюць шырокі розгалас, ствараюць беларусам станоўчы імідж у вялікім расійскім рэгіёне. Усяго ж, нагадаем, нашых суайчыннікаў у Прыбайкаллі звыш 50 тысяч, ёсць і цэлыя беларускія вёскі — гэтак званыя месцы кампактнага пражывання, дзе з часоў Сталыпінскай рэформы 1903–1912 гадоў жывуць нашчадкі перасяленцаў. “Праца нашага таварыства і скіравана на тое, каб дапамагаць беларусам Прыбайкалля, іх нашчадкам не забывацца на родную мову, шанаваць, адраджаць народныя традыцыі ва ўсёй іх велічы і прыгажосці”, — паведамляе Алег Рудакоў.

Дзяўчаты з натхненнем шануюць народныя абрады

Сфера прыкладання сіл энтузіястаў уражвае. Яны арганізуюць міжнародныя навукова-практычныя канферэнцыі, шмат увагі надаюць рабоце як з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, так і з моладдзю, дзецьмі. У таварыстве працуе 7 секцый па беларускіх традыцыйных рамёствах, а ў майстэрні ўсталяваны аўтэнтычныя ткацкія станкі, ці кросны, на якіх і цяпер ткуцца розныя прыгожыя рэчы, палотны для нацыянальных строяў. Толькі ў Іркуцку пры таварыстве створана пяць беларускіх па духу фальклорных і танцавальных гуртоў, у вобласці ж іх ужо 19.

Тэрыторыя міласэрнасці

Ірына Гардзіенка

У Гомелі завяршылі будаўніцтва Дзіцячай вёскі

Узвядзенне вёскі для дзяцей-сірот вялося шэсць гадоў на ахвяраванні вернікаў і дабрачынных каталіцкіх арганізацый Германіі, Італіі, Аўстрыі і іншых краін пры падтрымцы місіі “Карытас — міласэрнасць”. Нядаўна адбылося ўрачыстае асвячэнне вёскі, дзе будзе жыць 60 дзяцей-інвалідаў.

Ужо зусім хутка ў Дзіцячую вёску пераселяцца хлопчыкі і дзяўчынкі з Журавіцкага дома-інтэрната. Разам з імі ў новыя дамы пераедуць і іх апекуны — каталіцкія манахіні, якія ўжо многія гады даглядаюць дзяцей.

Многім будзе цікава: а што ж уяўляе з сябе Дзіцячая вёска ў Гомелі? Гэта пяць утульных катэджаў, побач з імі — каталіцкі кляштар, ёсць яшчэ і гаспадарчы корпус — з кухняй, пральняй і іншымі службовымі памяшканнямі. У самой жа вёсцы для яе жыхароў створаны ўсе ўмовы, максімальна набліжаныя да сямейных. І ў кожным новым доме будзе жыць сям’я — вялікая, але не больш за 12 чалавек разам з манахіняй. Усю ж неабходную дапамогу гэтым сем’ям па выхаванні, рэабілітацыі дзяцей-інвалідаў будуць аказваць спецыялісты.

У ГОД МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

“Дзівосна цэласны свет духоўна блізкіх мне людзей...”

Масквічка Ніна Дзябольская ўражана сугучнасцю беларускай паэзіі з французскай


Для Ніны Дзябольскай беларусы — родныя людзі

Сяргей Панізьнік

Сёлетні месяц студзень быў сцюдзёным для маскоўскага Дамадзедава, а ў Мінску я ў чарговы раз адчуў цеплыню, ветласць і прыязнасць ад новай сустрэчы з вернай сяброўкай нашай літаратуры Нінай Дзябольскай. Яна зноў наведала Беларусь, каб закончыць падрыхтоўку да выдання незвычайнай анталогіі: там сабраны сотні вершаў нашых паэтаў розных пакаленняў у яе перакладах на французскую мову. А зацікаўленасць яе беларускім паэтычным словам пачалася гадоў дваццаць таму. І падсвечваецца любоў да Беларусі вельмі цікавым фактам. Узгадайце сябра Максіма Багдановіча — Дзіадора Дзябольскага. А вось што піша Ніна Сяргееўна: “...Мой дзядзька Дзіадор Дзябольскі — сябар Максіма па Яраслаўлі — вёў і вядзе мяне па жыцці, прывёў у музей М. Багдановіча і да перакладаў... Пад час працы адкрываю для сябе новы, дзівосна цэласны свет духоўна блізкіх мне людзей... А галоўнае, мяне проста ўражвае сугучнасць беларускай паэзіі з французскай”.

І вось вынік натхнёнай дзеі Ніны Дзябольскай: на французскую мову перакладзена некалькі дзясяткаў вершаў Максіма Багдановіча (у падзяку класіку за пераклады французскіх паэтаў), а таксама паэтычныя творы Р. Барадуліна, Н. Мацяш, В. Коўтун, А. Разанава, В. Жуковіча — усяго больш як дваццаці паэтаў з Беларусі. Сваю захопленасць перакладчыца тлумачыць так: “Беларуская мова, па маіх адчуваннях, у чымсьці больш тонкая і выяўленчая, чым руская, і валодае нейкім асаблівым шармам, што дадае большай даступнасці для паэтычнага перакладу”.

Ніна Сяргееўна ўдзячна за дапамогу ў вытлумачэнні паэтычных вобразаў масквічу і нашаму земляку Івану Цярэнцьевічу Бурсаву, вядомаму паэту і слыннаму перакладчыку. Сама ж яна нарадзілася ў Маскве ў чэрвені 37-га, закончыла Інстытут замежных моваў, атрымала і мастацкую адукацыю. Працавала выкладчыкам, перакладчыкам. Піша вершы на рускай і французскай мовах.

Каб аддзячыць Ніне Сяргееўне за яе рэпрэзентацыю Беларусі ў свеце, я ўзяўся перакладаць яе вершы на мову Багдановіча. Прапаную адзін з твораў са спадзевам, што сябры Дзябольскай з часам выдадуць яе кнігу вершаў і ў Мінску.

У Полацку
І кветкі тут, нібы ў Расіі,
Такія ж вокны, гамана.
У скверах бюсты папрасілі
Сказаць, дзе мудрасць, дзе мана.
Крок нетаропкі, з ласкай слова,
З пяшчотнай думнасцю пагляд...
...А з мрояў сябрука былога
Ляцяць іскрынкі ў даўні сад.

Неабходнае пасляслоўе.

Бываюць жа супадзенні: пакуль рыхтаваўся да друку артыкул пра Ніну Дзябольскую, прынесены Сяргеем Панізьнікам, на рэдакцыйны стол лёг вершаваны зборнік самога паэта “На ўсе вякі…” і кампактны дыск “Арэлі: Сяргей Панізьнік у вершах і песнях”. У дыск, падрыхтаваны студыяй “P.L.A.N.”, між іншымі, увайшоў гімн “Дом дружбы” (музыка Эдуарда Зарыцкага, выкананне Якава Навуменкі) і “Вясельны марш для маладых” (выконвае капэла з вёскі Лінава Мёрскага раёна). Зборнік вершаў — рэдкі выпадак! — трохмоўны. У першых чатырох раздзелах (“На трэцяй планеце ад сонца”, “Млечны шлях”, “Пры свячэнні”, “Золкая зёлка”) творы змешчаны ў арыгінальным, беларускім гучанні. Далей ідуць англамоўныя пераклады амерыканца Дагмага Т. Уолката і мінчанкі Алены Таболіч. А ў заключнай частцы мы сустракаемся з масквічкай Нінай Дзябольскай, якая пераклала на французскую мову вершы самога Сяргея Панізьніка.

Сяргей Панізьнік прагне творчасці

У тэматыцы зборніка знайшлі шырокае адлюстраванне плённыя кантакты з літаратарамі і літаратурамі іншых краін. “Сяргей Панізьнік, — піша ў прадмове да кнігі паэт і крытык Міхась Скобла, — аднолькава жаданы госць у Празе, Рызе, Вільні, Львове… Пералік замежных сталіц і гарадоў можна было працягваць: беларускі паэт нястомна ўмацоўвае культурныя повязі з краінамі блізкага і далёкага замежжа. Рэдкі выпадак — ён адначасова з'яўляецца старшынёй Таварыства Беларусь — Латвія і намеснікам старшыні Таварыства Беларусь — Чэхія”.

Адам Мальдзіс

Летапісец з глыбінкі

Гісторыю адзінаццаці вёсак Камянецкага раёна ўзнавіў святар Васіль Туміловіч

Даследчык вывучаў архіўныя дадзеныя, навуковыя даследаванні гісторыкаў, запісваў успаміны мясцовых жыхароў. І напісаў гістарычны нарыс. Кніга выйшла ў адной з брэсцкіх друкарняў і хутка разышлася сярод прыхаджан цэркваў, у якіх служыць айцец Васіль. Гісторык па адукацыі, ён здолеў цікава і даступна апісаць падзеі, якія адбываліся ў тых месцах пачынаючы з XVIII стагоддзя.

Стварыць летапіс вёсак святару дапамагла і мясцовая ўлада. Як расказаў старшыня Навіцкага сельсавета Міхаіл Шабуня, айцу Васілю прадастаўляліся шматлікія дакументальныя матэрыялы. Цяпер, магчыма, унікальная кніга будзе перавыдадзена.

Трэба адзначыць, што летапіс — не першая праца Васіля Туміловіча, прысвечаная гісторыі Палесся. Ён напісаў ужо нямала гістарычных нарысаў пра Лунінецкі раён, адкуль родам. Прыехаўшы ў Камянецкі раён, заняўся і там вывучэннем народнай творчасці, выдаў кнігу “Фальклор Камянеччыны”.

Зверху — усё відаць!

Самая прыгожая панарама Мінска адкрываецца з кола агляду, што знаходзіцца ў былым Губернатарскім садзе

Цэнтральны дзіцячы парк імя Максіма Горкага размешчаны над Свіслаччу, непадалёк ад плошчы Перамогі і праспекта Незалежнасці. Дарэчы, раней гэта быў не парк, а Губернатарскі сад: яшчэ ў канцы XVIII стагоддзя яго заснаваў Захарый Карнееў, першы цывільны губернатар Мінска і Мінскай губерні. Цяпер у Дзіцячым парку працуе мноства сучасных атракцыёнаў. А самы папулярны сярод іх, аказваецца, — кола агляду. Яно самае вялікае ў Мінску: 54 метры.

ЗЕМЛЯКІ

Дарога з Дзівіна да Кіева. І дадому...

(Заканчэнне. Пачатак на стар. 1)

Штогод у Дзень незалежнасці па запрашэнні кіраўніцтва Беларусі Віталь Курашык — у Мінску ў складзе дэлегацыі ветэранаў з Украіны прымае ўдзел у свяце. Піша, што дагэтуль пад вялікім уражаннем ад леташняй урачыстай цырымоніі перазахавання астанкаў воінаў, загінулых за Айчыну, у крыпце Усіхсвяцкага храма. Расказваючы пра гэта іншым, з гонарам заўважае: “Беларусы памятаюць мінулае, таму ў нас ёсць будучыня!” Пасля ўрачыстасцяў ён наведвае магілу бацькі, які пахаваны ў Мінску, едзе да сяброў і родных у Дзівін. Зрэшты, амаль штодзень размаўляе з землякамі па тэлефоне, з многімі — сувязь па электронной пошце. З інтэрнэтам былы пасол на ты. Нагадвае, што “актыўны беларус Аляксандр Драгун стварыў сайт Усеўкраінскага саюза беларусаў”, і якраз Віталь Уладзіміравіч — сярод тых, хто падбірае туды цікавую інфармацыю. Каардынатары атрымліваюць яе ад рэгіянальных суполак. “У тым ліку і дзякуючы сайту пра нас ведаюць у розных краінах, — з гонарам піша В. Курашык. — Я маю стасункі з беларусамі практычна ўсіх абласцей Украіны. Шматлікім украінцам, ды і землякам, скарыстоўваючы жыццёвы досвед і былыя сувязі, дапамагаю наладжваць, развіваць эканамічныя, гуманітарныя сувязі з Беларуссю. Яшчэ мы, беларусы Украіны, выдаём кнігі, газеты, вядзём перадачы на радыё, арганізуем розныя святы, фэсты — усяго не пералічыць! Да таго ж я актыўна працую ў Міжнароднай арганізацыі “Данеччына”, у зямляцтве “Крым”, уваходжу ў палітбюро партыі Грамадзянская Салідарнасць. І новыя кнігі пішу. Так што сумаваць няма калі!”

Такой актыўнасці чалавека, якому восьмы дзясятак, можна пазайздросціць. Як ён арганізуе дзень? “Раніцай — абавязкова зарадка, душ, потым сняданак, гэта звычайна беларускі тварог і кава са згушчаным малаком з горада Рагачова Гомельскай вобласці, — ахвотна адказвае зямляк. — Чытанне пошты, у тым ліку і электроннай. Знаёмлюся з навінамі: што адбываецца ў Беларусі, ва Украіне, у свеце? Далей пішу або чытаю. Пішу старамодна: ручка кітайская, чарніла, папера фінская. Затое ёсць рукапіс, які пацвярджае: гэта мая праца! Пасля абеду, як рабіў і некалі Рузвельт, — гадзіна адпачынку. І затым сустрэчы, мерапрыемствы, прыёмы ў пасольствах, іншых арганізацыях і ўстановах. А ўвечар — сямейны чай”.


Віталь Курашык ля родных сцен

Цяпер ён піша кнігу-даследаванне пра асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў і ўкраінцаў. “Чым мы падобныя, а чым адрозніваемся? Думаю, гэта будзе цікава прааналізаваць! — разважае аўтар. — Я назіраю, як па-рознаму паводзяць сябе ўкраінцы і беларусы ў некаторых сітуацыях. Мой сын, Уладзімір, часта бываў са мной у Мінску, на Палессі, у Брэсцкай крэпасці, Белавежскай пушчы і ў шматлікіх гарадах і мястэчках. Ён ад Беларусі, беларусаў у захапленні! Згадвае, як ішоў неяк па Дзівіне — а малодшыя дзеці віталіся з ім, бачачы ўпершыню! І жонка мая, Ала Мікалаеўна, украінка, дагэтуль кажа: “Я хацела б жыць на тваёй Радзіме!” Ды ўжо надта моцна мы тут, ва Украіне, пусцілі карані за многія гады”.

Віталя Курашыка радуе, што Беларусь, пераадольваючы розныя цяжкасці, жыве і развіваецца. Што ён мае магчымасць і ў Кіеве купляць якасныя беларускія тавары, у тым ліку смачныя малочныя і мясныя вырабы. Засмучае ж яго, калі часам кажуць няпраўду пра Беларусь — тады ён абавязкова заступаецца за яе. Кажа: як сын за маці…

Хутка, праз месяц, ён зноў будзе ў Мінску. І жыве ўжо прадчуваннем цёплых і хвалюючых сустрэч з роднымі, са сваёй маладосцю.

У бібліятэках Астравеччыны сабрана шмат цікавых выданняў

КУЛЬТУРНАЯ ПЛЯЦОЎКА

У кнігалюбаў тут цікавы асяродак

Бібліятэкары Астравеччыны ў Дзень славянскага пісьменства запрасілі ў госці калег з Мядзельшчыны

Не кожны год, вядома ж, надараюцца такія карысныя сустрэчы, тым больш паміж бібліятэкарамі з розных абласцей. Ды варта толькі захацець — і ўсё атрымаецца! Калегі сустракаліся ў Астравецкім раёне, наведвалі вясковыя бібліятэкі. Нам, гаспадарам, вядома ж, прыемна было бачыць у вачах гасцей захапленне. А яны звярталі ўвагу і на прыгожае афармленне стэндаў, і на шырокі выбар кніг. Мядзельцы цікавіліся, як камплектуюцца фонды, якія дадатковыя паслугі ў бібліятэках могуць атрымаць чытачы, ці займаемся мы падпіскай на перыёдыку.

Кожная з нашых бібліятэк як бы абараняла адзін з кірункаў сваёй "прыярытэтнай" дзейнасці. Прыкладам, у Рымдзюнскай бібліятэцы цікава працуе інфармацыйна-адукацыйны цэнтр для дзяцей і падлеткаў. А як захапіць кнігай чытачоў яшчэ з дзіцячага ўзросту — пра тое і расказала загадчыца.

У Гервятах жа ў нас не проста бібліятэка, гэта адначасова і Цэнтр нацыянальных культур. Калегі там даведаліся, як рэалізуецца бібліятэчная доўгатэрміновая праграма "Жыццё ў згодзе", распачатая сёлета. А супрацоўнікі Міхалішкаўскіх установаў культуры — бібліятэкі, Дома культуры і школы мастацтваў — па даўняй беларускай традыцыі віталі гасцей хлебам-соллю, а таксама і звонкай песняй у выкананні аматарскіх калектываў.

Вынікі работы мы падводзілі ў Астраўцы, у Цэнтральнай раённай бібліятэцы. Гаспадары і госці абмяняліся памятнымі падарункамі, кнігамі па краязнаўстве. Госці шчыра дзякавалі: ім цікава было паглядзець, як мы працуем, а таксама павандраваць па знакамітых мясцінах Астравеччыны.

Вольга Пінчук,
намеснік дырэктара Астравецкай цэнтральнай бібліятэчнай сістэмы Гродзенскай вобласці

ВЕСТКІ

І натхненне, і захапленне

У мастакоў на міжнародным пленэры пад Гродна — свой погляд на адпачынак у вясковых сядзібах

Пленэр праходзіў на месцы загараднай сядзібы Тызенгаўза. Праўда, сам гродзенскі староста Антоній Тызенгаўз будаўніцтва тут некалі толькі распачаў, завяршылі ж іншыя ўладальнікі. Апошні, каму належаў маёнтак, быў граф Козел-Паклеўскі. У савецкія часы будынак доўга пуставаў, цяпер жа гэтае месца ператварылася ў гасцінны куток для турыстаў. Першымі, хто змог ацаніць зробленае рэстаўратарамі, сталі мастакі. Мастачка з Польшчы Іона Русінек Беларусь наведала ўпершыню. На пленэры яна збіралася маляваць прыроду, ды на месцы планы цалкам змяніла. "У вёсцы столькі тэм для мастака! Мяне заварожвае архітэктура — і замкавая, і драўляная", — прызналася госця.

Мастакоў, дарэчы, канкрэтнай тэмай не абмяжоўвалі. Пленэр назвалі "Гісторыя і сучаснасць". Па заканчэнні работы карціны ўдзельнікаў творчай сустрэчы першымі ўбачаць жыхары Гродна. Пасля вясковыя пейзажы пабываюць у Літве і Польшчы.

У сталіцу – з песнямі!

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры можна пабачыць выступленні самадзейных артыстаў з розных рэгіёнаў краіны

Такое стала магчымым дзякуючы сацыяльна-культурнаму праекту "Рэгіёны". Ён і задуманы для таго, каб літаратурна-мастацкую спадчыну з рэгіёнаў Беларусі лепш ведалі ў сталіцы

Праект, нагадаем, пачаўся сёлета ў студзені. Тады прайшла творчая сустрэча мінчан з вядомымі ўраджэнцамі Случчыны: пісьменнікамі, даследчыкамі, літаратуразнаўцамі.

Тады ж ладзіліся і выставы "Вандроўка: зіма — лета" мастачкі Алены Хатэнкі і "Лялечны карагод" майстроў Квасыніцкага цэнтра рамёстваў, выступалі фальклорныя калектывы "Ячаўскія вячоркі" і "Вясейка" з Вясейскай сярэдняй школы.

Цяпер эстафету прыняла Вілейшчына — рэгіён, багаты сваімі талентамі, цікавымі пачынаннямі і вядомымі людзьмі. На прэзентацыі праграмы, якая прайшла ў музеі на пачатку чэрвеня, было шмат цікавых людзей. Хораша выступіў народны калектыў аўтарскай песні "Элегія" з Вілейскага Палаца культуры. "Пад час імпрэз мы звяртаем увагу на літаратурна-мастацкую творчасць у рэгіёнах, — удакладніла супрацоўніца музея Лідзія Шагойка. — У апошні раз гучалі вершы паэта з Вілейшчыны Івана Лашуткі, Уладзіміра Цануніна. Хораша вялі рэй кіраўніца "Элегіі" Таццяна Захарыч і журналіст Алесь Вінярскі".

КРЫЖАВАНКА

Лагодны чэрвень — лецейка пачатак

Па гарызанталі:

1. "…, на сенажаці медунічка, …". З беларускай народнай песні "На сенажаці медунічка". 3. "Але … — пачатак лета". З паэмы Якуба Коласа "Новая зямля". 8. Мужчынскае імя. 9. Каму што, а курыцы … (прык.). 11. "… збірае, а зіма паядае" (прык). 12. "Чырвонае карамысла праз рэчку павісла" (заг.). 13. Багіня лета. 16. Урачысты верш. 17. Прадукты харчавання. 19. Знак Задыяка, на які прыходзіцца апошняя дэкада чэрвеня. 20. Сістэма ўмоўных знакаў, сігналаў. 23. Не чакай з … дараванага хлеба (прык.). 24. "Будзе тут …,\ Будзе тут рабінка". З верша Янкі Купалы "Перад Сёмухай". Сёлета Сёмуха, ці Тройца адзначаецца 12 чэрвеня. 27. Тое, чым абмахваюцца ў летнюю спякоту. 30. Колас добра не спее, калі … не грэе (прык.). 31. Спосаб летазлічэння. 32. Агародная расліна, лісты якой сырымі ўжываюцца ў ежу. 33. Вада … прабівае (прык.).

Па вертыкалі:

1. "Натачы, …,\ Вострым-востра сярпок". З верша Янкі Купалы "Зажынкі". 2. Засеянае поле. 4. Прарок, дзень ушанавання якога 28 чэрвеня. Прыйшоў … — цягне ўгору авёс (прык.). 5. Адплата за дабро. 6. Дарожка ў парку або ў садзе. 7. Птушка, якая ў чэрвені робіць штодня да 200 вылетаў з кубла. 8. "На Яна баба п'яна, а на … — у жыце ядро" (прык). 10. Прысвятак беларускага народнага календара, дзень ільну: адзначаўся 3 чэрвеня . Казалі: "На … сей лён і грэчку". 14. Тое, што і васілёк. 15. Ласкавая назва лета. 18. Не думай, што заўтра мароз, а ідзі на … (прык). 19. Загадка. 21. "Ластаўка … пачынае, а салавей канчае" (прык.). 22. … не гуляе — ураджай люляе (прык.). 25. Белы клён. 26. "… любіць сытага, а цэп — галоднага" (прык). 28. Пушны звярок. 29. На Усціна лета ўдаецца — … добрым коласам нальецца (прык.). Усцін — прысвятак, які адзначаецца 14 чэрвеня.

Падрыхтаваў
Лявон Целеш



Адказы на крыжаванку

Па гарызанталі: 1. Кайліна. 3. Касбёа. 8. Пакеп. 9. Прося. 11. Лета. 12. Вясёлка. 13. Цёця. 16. Ода. 17. Ежа. 19. Рак. 20. Кой. 23. Неба. 24. Вярэжка. 27. Веер. 30. Соица. 31. Стыль. 32. Салата. 33. Камень.

Па вертыкалі: 1. Кавалёк. 2. Ніва. 4. Амос. 5. Адплата. 6. Алея. 7. Шпак. 8. Пятро. 10. Аціна. 14. Валошка. 15. Лецёпка. 18. Сенакос. 19. Рэбус. 21. Цзень. 22. Чэрвень. 25. Ялаф. 26. Каса. 28. Янот. 29. Жыта.

Заснавальнік: Рэдакцыя газеты «СБ»
Рэдактар Віктар Харкоў
Адрас: пр. Незалежнасці, 44, Мінск, 220005
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 61
Тэлефон рэдакцыі: +375 17 288—12—80; факс: +375 17 288—12—80
Бюро па рэкламе: Тэл. +375 17 290—60—11
E–mail: golas_radzimy@tut.by
Газета надрукавана на Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
Аб'ём выдання: 1 друк. арк.
Тыраж: 1960
Заказ: 664
Пазіцыі рэдакцыі і аўтараў, матэрыялы якіх друкуюцца на старонках "Голасу Радзімы", могуць не супадаць.
© "Голас Радзімы", 2011